WILL of GOD
316

# Як я магу ведаць Божую волю?

*«і не прыпадабняйцеся веку гэтаму, але перамяняйцеся праз абнаўленьне розуму вашага, каб вам выпрабаваць, што ёсьць воля Божая, што добрае, і прыемнае Богу, і дасканалае.»* Рымлянам 12:2

Ведаць і выконваць Божую волю вельмі важна. Будзь як Ісус. Ён сказаў, што Ён прыйшоў на зямлю, *«не дзеля таго, каб чыніць Маю волю, але волю Таго, Хто паслаў Мяне»* Эвангельле паводле Яна 6:38. Большую частку Божай волі можна прымяніць да ўсіх веруючых такім самым чынам. Аднак у Бога ёсьць індывідуальная воля для вернікаў, якую Ён пастунова адкрывае, калі вы расьцеце ў сваім штодзённым верным шляху з Ім. Вы можаце ведаць Божую волю. Ён дасьць вам разуменьне. *«Спадзявайся на ГОСПАДА ўсім сэрцам тваім і не абапірайся на розум твой. Думай пра Яго на ўсіх шляхах тваіх, і Ён выпрастуе сьцежкі твае»*, Прыповесьці 3:5-6. Вы ведаеце з Бібліі агульную волю Божую для ўсіх вернікаў. Вы ведаеце Яго індывідуальную волю як несупярэчлівае спалучэньне Яго Слова і пабожнага паслухмянага жыцьця. На падмурку паслушэнства вы можаце вызначыць і выконваць Яго волю для сябе. Спытайце ў Айца. Шукайце кіраўніцтва ў Яго Слове, Яго мудрасьці, Яго народзе і Яго супакоі. Калі вы ведаеце Божую волю, слухайцеся Яго.

**АГУЛЬНАЯ ВОЛЯ БОГА.** Большая частка агульнай волі Божай знаходзіцца ў запаведзях, прынцыпах і прыкладах Бібліі. Біблія – асноўная крыніца для спазнаньня Божай волі для вашага жыцьця. *«Слова Тваё – сьветач для ног маіх і сьвятло на сьцежцы маёй»*, Псальм 119:105.

1. Прыказаньні. У Бібліі ёсьць шмат прыказаньняў для ўсіх вернікаў, такіх як, *«Заўсёды радуйцеся. Несупынна маліцеся. За ўсё дзякуйце, бо такая для вас воля Божая ў Хрысьце Ісусе»*, 1 да Тэсалонцам 5:16-18 і *«Бо гэта ёсьць воля Божая – сьвятасьць вашая, каб вы высьцерагаліся распусты»*, 1 да Тэсалонцам 4:3. Ісус сказаў: *«Калі любіце Мяне, захоўвайце прыказаньні Мае»*, Эвангельле паводле Яна 14:15. Разумейце кантэкст прыказаньняў. Бог сказаў Ною пабудаваць каўчэг, Быцьцё 6:14. Бог не казаў вам рабіць гэта. Бог сказаў Давіду пайсьці ў Хеброн, 2 Самуіла 2:1. Бог не казаў вам рабіць гэта. Не вырывайце прыказаньне з яго кантэксту.

2. Прынцыпы. Ёсьць біблейскія прынцыпы, якіх вы павінны прытрымлівацца. Прынцып добрага гаспадараньня знаходзіцца ў Эвангельлі паводле Лукі 16:1-13. Кошт вучнёўства – у канцы Эвангельля паводле Лукі – у 14 разьдзеле. Прынцып пошуку заблукаўшых людзей – у трох прыповесьцях Эвангельля паводле Лукі разьдзел 15. Прытрымлівайцеся гэтых і іншых прынцыпаў з Бібліі.

3. Прыклады. Прыказаньні і прынцыпы Бібліі даюць вам агульную волю Божую для вашага жыцьця. У Бібліі ёсьць прыклады, якія мы павінны пераймаць. Найлепшы прыклад – жыцьцё Ісуса. Памыўшы ногі вучням, Ісус сказаў: *«бо Я даў вам прыклад, каб, як Я зрабіў вам, і вы рабілі»*, Ян 13:15. Мы павінны пераймаць Яго прыклад пакоры, Філіп. 2:3-5. Мы павінны ісьці па Яго сьлядах, *«Бо вы на гэта пакліканыя, бо і Хрыстос перацярпеў за нас, пакінуўшы нам прыклад, каб мы ішлі па сьлядах Ягоных»*, 1 Пётры 2:21. *«З гэтага даведваемся, што мы ў Ім. Хто кажа, што ў Ім застаецца, павінен хадзіць так, як Ён хадзіў»*, 1 ліст Яна 2:5-6.

**ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ.** Бог не хлусіць, Псальм 119:160. Бог не будзе весьці вас і не скажа вам не падпарадкоўвацца Яго Слову. Ісус дае лідараў, каб наставіць нас, Эфесянам 4:11-14. Аднак ёсьць шмат ілжывых настаўнікаў, 2 Цімафею 4:3-4. Ніколі не верце, што Бог кажа вам не падпарадкоўвацца Яго Слову. Бог ніколі так не робіць. Калі царкоўны лідэр кажа вам не падпарадкоўвацца Слову Божаму, – гэта ілжывае вучэньне.

**ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ВОЛЯ БОЖАЯ.** У Бога ёсьць індывідуальная воля для веруючых, Псальм 32:8, Прыповесьці 3:5-6. Падпарадкоўвайцеся агульнай волі Божай. Потым, каб даведацца Яго індывідуальную волю, настойліва прасіце Бога, каб Ён вам адкрыў яе. Шукайце Яго адказ у Ягоным Слове, Ягонай мудрасьці, Ягоным народзе і Ягоным супакоі.

**Прасіце.** Маліцеся малітвай Давіда: *«Навучы мяне рабіць тое, што даспадобы Табе»*, Псалом 143:10. Апостал Павел маліўся, каб вернікі ў Калосах *«былі напоўнены пазнаннем Ягонай волі»*, Каласянам 1:9. Ваша настойлівая малітва за сябе і за іншых павінна спрыяць спазнаньню і выкананьню Божай волі.

**Набывайце кіраўніцтва.** Бог адкрывае Сваю індывідуальную волю праз Сваё Слова, Сваю мудрасць, Свой народ і Свой супакой. Прасіце Бога адкрыць вам Сваю волю. Ён адкажа на вашыя малітвы праз:

1. Яго Слова. Ведаць індывідуальную волю Божую – гэта вынік рэгулярнага вывучэньня Бібліі. Воля Божая для вас становіцца зразумелай, калі вы атрымліваеце мудрасьць і разуменьне з Яго Слова. Ён ніколі не закліча вас рабіць нешта, што супярэчыць Яго Слова.

2. Яго мудрасьць. Божая мудрасьць паходзіць з духоўнага паслушэнства, 1 ліст да Карынцянаў 2:14-15. *«і не прыпадабняйцеся веку гэтаму, але перамяняйцеся праз абнаўленьне розуму вашага, каб вам выпрабаваць, што ёсьць воля Божая, што добрае, і прыемнае Богу, і дасканалае»*, Ліст да Рымлянаў 12:2. Прасіце Бога Ягонай мудрасьці, *«Калі ж у каго з вас не хапае мудрасьці, няхай просіць у Бога... і будзе яму дадзена»*, Ліст Якуба 1:5.

3. Ягоны народ. Народ Божы таксама зьяўляецца крыніцай для разуменьня Божай волі. Тыя, хто верна навучаюць Ягонаму Слову вусна або пісьмова, могуць дапамагчы, Каласянам 1:28. Добра зьвяртацца па параду да сьпелых веруючых. Зьвяртацца па параду да некалькіх чалавек – добрая ідэя, *«Бяз рады руйнуюцца намеры, а з мноствам дарадцаў яны зьдзяйсьняюцца»*, Прыповесьці 15:22. Сьпелыя хрысьціяне не зьяўляюцца беспамылковымі, але яны могуць адкрыць вам глыбокае разуменьне, якое дапаможа вам вызначыць Божую волю.

4. Ягоны супакой. Божы супакой – гэта канчатковае пацьверджаньне Ягонай індывідуальнай волі, *«і няхай гаспадарыць у сэрцах вашых супакой Божы, да якога вы і пакліканыя ў адным целе, і будзьце ўдзячныя»*, Каласянам 3:15. *«і супакой Божы, які вышэй за ўсякі розум, няхай захавае сэрцы вашыя і думкі вашыя ў Хрысьце Ісусе»*, Філіпянам 4:7. Гэты супакой зьяўляецца дадзеным Богам глыбокім адчуваньнем слушнасьці прынятага рашэньня, якое прыходзіць пасьля малітвы, вывучэньня Бібліі, духоўнай мудрасьці і разуменьня ад духоўна сталых настаўнікаў. Шукайце і чакайце Яго супакою.

**Дзейнічайце.** Калі вы запытваецеся, ці нешта зьяўляецца Яго воляй, адказ можа быць «не», як было ў Паўла, 2 Карынфянам 12:7-10. Ён можа гучаць як «пачакай». Яго адказ «пачакай» можа прывесьці да вялікага дабраславеньня, Ісая 40:31. Калі адказ Бога – «так», выконвайце Яго волю, нават калі гэта цяжка, непапулярна ці будзе каштаваць вам. Мы павінны з задавальненьнем выконваць Ягоную волю ад усяго сэрца, Псальм 40:8, Эфесянам 6:5-6. Сьцеражыцеся зманлівых адказаў, якія гучаць ад імя хрысьціянства. Падпарадкоўвайцеся, калі вы ўпэўнены, што ведаеце Божую волю.

---

*Як я магу ведаць Божую волю?* © 2026, Джон Д. Морыс III, выдадзена арганізацыяй «Acts One Eight». Вы можаце свабодна друкаваць, капіяваць, разьмяшчаць у інтэрнэце, дасылаць па электроннай пошце або прыватнымі паведамленьнямі, не зьмяняючы зьмест і прадстаўляючы яго цалкам. Вы можаце дадаць назву або лягатып вашага служэньня ці царквы ўверсе першай старонкі і дадаць вашу кантактную інфармацыю над лініяй каля ніжняй часткі другой старонкі. WillofGod316.org грунтуецца толькі на Бібліі. Брашура існуе, каб дапамагчы вернікам адкрыць Божую волю. Вы можаце напісаць у Acts One Eight (па-магчымасці па-ангельску) на адрас: Hello@Mail316.org. Пераклад быў выкананы www.ChristianLingua.com. *Як я магу ведаць Божую волю?* даступна бясплатна на www.WillofGod316.org на сарака васьмі мовах. Цытаты з Бібліі ў ангельскай вэрсіі ўзяты з «Lockman Foundation’s New American Standard Bible» 1995 года выданьня. Цытаты з Бібліі ў гэтым перакладзе ўзяты з перакладу Антонія Бокуна на беларускую мову.